# НОВАЕ Ў ПРАФЕСІЙНЫМ ПЕНСІЙНЫМ СТРАХАВАННІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Але высветлілася, што з-за невялікага перыяду і сум адлічэнняў назапашаная пенсія ў такіх людзей аказалася вельмі нізкая.

Вось як тлумачыць гэтую сітуацыю на сайце Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі намеснік старшыні ФПБ Алена Манкевіч: «Напрыклад, трактарыст-машыніст ва ўзросце 48 гадоў працуе ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве. На 1 студзеня 2009 года яго стаж складае 13 гадоў, а пасля 1 студзеня — 9 гадоў і 7 месяцаў. Атрымліваецца, што калі мужчына хацеў атрымліваць датэрміновую пенсію па старых правілах, ён ужо у 2019 годзе павінен быў адмовіцца ад сваёй работы (каб не перавысіць планку ў 10 гадоў стажу). Калі ён усё ж вырашыў застацца, а на пенсію выйсці ў 58 гадоў, то выплаты яму разлічаць толькі па новых правілах (стаж пасля 1 студзеня 2009 года акажацца большы за 10 гадоў). Пры гэтым мужчына не зможа працаваць на ранейшай пазіцыі, а памер выплат, тобок датэрміновая пенсія за асаблівыя ўмовы працы, складзе 40—60 рублёў у месяц. Хутчэй за ўсё, афармляць датэрміновую пенсію дзеля такіх грошай трактарыст не будзе і яму нічога не застанецца, як чакаць дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту».

У такую пенсійную пастку трапіла каля 20 тысяч чалавек, палова з якіх занятыя ў сельскай гаспадарцы. Але праблема закранае і работнікаў лёгкай прамысловасці, гарадскога транспарту, авіяцыі і іншых.

Таму быў прыняты Указ № 15, які дае права чалавеку, што напрацаваў не менш за палову стажу да 2009 года, вярнуцца ў старую пенсійную сістэму. І ён зможа атрымліваць пенсію, працягваючы працаваць, напрыклад, трактарыстам, у памеры пенсіі па ўзросце.

У 2021 годзе да атрымання прафесійнай пенсіі падыдуць медыцынскія і педагагічныя работнікі. У адпаведнасці з новым указам яны таксама змогуць вярнуцца ў звычайную пенсійную сістэму.

**Як адзначыла ў інтэрв'ю праграме «Галоўны эфір» на канале «Беларусь 1» міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ, летась у асаблівых умовах працы ў нашай краіне працавала каля 350 тысяч чалавек. Больш за ўсё сярод іх налічваецца медыцынскіх і педагагічных работнікаў (больш за 150 тысяч), далей ідуць тыя, хто працуе ў асабліва шкодных і шкодных умовах (120 тысяч), трактарысты (34 тысячы), даяркі і жывёлаводы (30 тысяч), кіроўцы гарадскога і пасажырскага транспарту (больш за 10 тысяч). Пры гэтым, як адзначыла міністр, у параўнанні з 2009-2010 гадамі колькасць рабочых месцаў з асаблівымі ўмовамі працы скарацілася на 30 %.**

## Іншыя новаўвядзенні ўказа

Згодна з дадзеным указам, таксама будуць павышаны больш чым у два разы тарыфы ўзносаў для работадаўцаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне работнікаў, занятых на работах з асаблівымі ўмовамі працы або асобнымі відамі прафесійнай дзейнасці. Гэтае новаўвядзенне ўвойдзе ў сілу з 1 студзеня 2021 года.

Спецыялісты адзначаюць, што яно дасць магчымасць павысіць гарантыі годнай пенсіі і ўзровень датэрміновых ільготных пенсій грамадзян з вялікім стажам працы ў неспрыяльных умовах, а таксама забяспечыць фарміраванне ў далейшым больш высокіх памераў пенсійных выплат у сістэме прафесійнага пенсійнага страхавання.

У цэлым, як адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, указ пашырае пераходны перыяд, але не прыводзіць да прыпынення дзеяння сістэмы прафесійнага пенсійнага страхавання. Асобы, у якіх да 1 студзеня 2009 года сфарміраваны нязначны спецыяльны стаж, будуць у далейшым афармляць пенсію па правілах прафесійнага пенсійнага страхавання.

## Як можна будзе выкарыстаць прафесійныя пенсійныя накапленні

Работнікі, пенсіі якіх будуць разлічвацца па правілах прафесійнага пенсійнага страхавання, будуць мець права на тры варыянты выкарыстання прафесійных пенсійных накапленняў.

**Першы варыянт** — фарміраванне датэрміновай прафесійнай пенсіі. Работадаўца будзе выплачваць за гэтага работніка абавязковыя ўзносы на прафесійнае пенсійнае страхаванне ў дзяржаўны пазабюджэтны фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН), з якіх пасля будзе выплачвацца датэрміновая пенсія, а затым, калі работнік дасягне агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, ён будзе атрымліваць ужо агульнаўстаноўленую пенсію.

**Другі варыянт** — работнік можа выбраць замест датэрміновай прафесійнай пенсіі дадатковую прафесійную пенсію. Яна будзе прызначацца пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту і раўняцца памеру БПМ. Атрымліваць асноўную і дадатковую пенсіі можна будзе столькі гадоў, на колькі назапашана пенсійных зберажэнняў дадаткова да пенсіі па ўзросце.

**І трэці варыянт,** згодна з якім работнік можа адмовіцца ад датэрміновай і дадатковай пенсій, а замест гэтага атрымліваць штомесячную даплату да зарплаты, памер якой вызначаецца работадаўцам, але не можа быць меншы за суму ўзносу на прафесійнае пенсійнае страхаванне за гэтага работніка. Гэта значыць, такія ўзносы не будуць назапашвацца, а замест таго выплачвацца самому работніку як прыбаўка да заработнай платы.

**Святлана БУСЬКО.**

# МЕРСЕДЭС, ЛУНА, ТАМЕРЛАН, МАРС...

## Беларусы ўсё часцей называюць дзяцей унікальнымі імёнамі

**Летась у краіне нарадзілася больш за 88 тысяч немаўлят. Лідарамі ў гэтай справе сталі сталіца — тут зарэгістравана звыш 19 тысяч актаў аб нараджэнні, Брэсцкая вобласць — больш за 14,1 тысячы, Гомельская — 13,4 тысячы і Мінская — 12,6 тысячы. У «топавую» дзясятку імёнаў краіны ўвайшлі Максім, Арцём, Міхаіл, Аляксандр, Мацвей, Сафія, Ганна, Марыя, Ксенія, Настасся.**

Рэдкім імёнам беларусы аддаюць перавагу ў сталіцы (у Мінску заключаецца больш за ўсё інтэрнацыянальных шлюбаў) і абласных цэнтрах, прычым найчасцей даць унікальнае імя бацькі імкнуцца дзяўчынкам. Прынамсі, у Мінску імёны 180 хлопчыкаў і 251 дзяўчынкі цягам года не паўтарыліся, — расказала **Вольга ШЫБКО, прэс-сакратар Міністэрства юстыцыі Беларусі.** — Так з'явіліся сталічныя Асоль, Венера, Джэніфер, Леля, Рагнеда, Фадзей, Оскар, Дабрамір, Іў, Вітаўт.

Іншыя рэгіёны таксама не застаюцца ўбаку ад



моды на непаўторнасць. У краіне цяпер жывуць дзяўчынкі Мерседэс, Германіка, Айсель, Весяліна, Златаславія, Мілэдзі, Дабраміла, Эльза, Аян, Ясна, Луна, Лея, Вірсавія, Лазарына, Любава, Ясміна, Сімона, Сена, Фёкла, Эліс, Юнона, Ядвіга. З хлопчыкаў пахваліцца незвычайнымі імёнамі могуць Геральд, Філат, Саламон, Тамерлан, Франц, Марс, Каміль, Аўтандзіл, Мейліс, Тадэвуш, Фама, Марцін, Лявонцій.

Дзіцяці ў Беларусі можна даць не больш за два імені, якія не супярэчаць нормам маралі. Галоўным будзе лічыцца тое, што запісана ў акце аб нараджэнні першым.

**Ірына СІДАРОК.**

# Кардыёлагі і тэрапеўты ў адной суполцы

**Беларускае таварыства кардыёлагаў і тэрапеўтаў зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі краіны. Арганізацыя аб'ядноўвае спецыялістаў галіны аховы здароўя, якія займаюцца навукова-даследчай, педагагічнай і практычнай дзейнасцю, удасканальваюць метады дыягнастыкі і лячэння, укараняюць у практыку найноўшы вопыт і дасягненні кардыялогіі і тэрапіі.**

**Старшыня суполкі, прафесар, урач вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па тэрапіі, вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па кардыялогіі, загадчык кафедры сталічнага медыцынскага ўніверсітэта Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ** адзначае:

— За апошнія 11 гадоў мы правялі каля 40 мерапрыемстваў рэспубліканскага і міжнароднага значэння, у тым ліку два кангрэсы кардыёлагаў і тэрапеўтаў. Ідэя аб'яднаць спецыялістаў розных профіляў нарэшце запатрабавала стварэння такога аб'яднання. Гэта дапаможа падрыхтаваць больш сур'ёзную платформу для падобных мерапрыемстваў, а таксама — актыўней уцягваць у работу ўрачоў з адпаведным вопытам з рэгіёнаў і з-за мяжы.

**Ірына СІДАРОК.**

# ПРЫСВОІЛІ ЗНОЙДЗЕНУЮ ДЗІЧЫНУ

## І сталі фігурантамі крымінальнай справы

**Двое жыхароў Пружанскага раёна не займаліся незаконным паляваннем, але адкажуць за браканьерства.**

Як паведамілі ў МУС, інспектары прыродааховы ўвечары на трасе сустрэлі мужчыну з нажом і ў акрываўленай вопратцы. Калі яго спыталі, што адбылося, ён пачаў блытана расказваць, што, маўляў, па просьбе знаёмых разбіраў цяля на суседняй ферме. Памагатаму не паверылі і для далейшых разбораў выклікалі міліцыю.

Праваахоўнікі высветлілі, што жонка затрыманага ехала дадому і стала сведкай ДТЗ: недалёка ад вёскі аўтамабіль збіў лася, які выбег на дарогу. Жывёла загінула. Дабраўшыся дадому, жанчына расказала пра здарэнне мужу.

Не жадаючы адмовіцца ад бясплатнай дзічыны, мужчына папрасіў суседа з матаблокам дапамагчы з транспарціроўкай жывёлы. На месцы аварыі яны разабралі тушу, сусед павёз здабычу ў вёску, а арганізатар «аперацыі» пайшоў дадому пешшу і папаўся інспектарам. Заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




Я не з гэтай зімы. Не.
Я адтуль, дзе снягі паляглі, —
Там мароз маляваў на шкле,
Зіхацелі ільдзінкі ў галлі.
Снег у той незваротны час
Самы чысты і светлы быў,
Як матулін ручнік на абраз,
Я той снег не забыў. Не забыў...
У хаўрусе слаты і смугі,
У дажджах, што заміж маразоў,
Успаміны пра тыя снягі
Саграваюць мяне зноў і зноў.
Можа, людзі забудуць зіму,
Цепліня, нібы рай, ахіне —
Але ж я і тады паўтару:
Я не з гэтага раю. Не.

